## Дарэвалюцыйны перыяд

Запіс у «Памятной книжке Могилевской губернии на 1910 годъ» выдання Магілёўскага Губернскага Статыстычнага Камітэта 1910 года на старонцы 301 сведчыць, што ў вёсцы Стоўпня дзейнічала царкоўна-прыходская школа. Настаўнікам быў сын псаломшчыка Аляксей Уладзіміравіч Бекарэвіч, які жыў у в. Салтанаўка (зараз – Жлобінскі раён).






(г. Рогачевъ).

Рысковская — учит. крест. Іосифъ Васил. Амвросенковъ, прав., пери. учит. шк. (Лѣсовая Буда).

Рѣнковская — учит. мѣщ. Василій Михайл. Климовичъ, прав., дух. семин. (Тихиничи).

Селецкая — учит. крест. Ѳома Петр. Новичковъ, прав., второкл. шк. (Буда Кошелевская).

Симоновская — учит. крест. Семенъ Троф. Сытенковъ, прав., двухкл. шк. (Солтановка).

Стрѣньковская — учит. крест. Титъ Исидор. Ткачевъ, прав., двухкл. шк. (г. Рогачевъ).

Старо-Олешнянская — уч-ца мѣщ. Татьяна Стеф. Маслакова, прав., второкл. шк. (Кристополье).

Столпнянская — учит. с. псаломщ. Ал-сѣй Владим. Бекаревичъ, прав., второкл. шк. (Солтановка).

Слободо-Бѣлицкая — учит. крест. Павелъ Луковъ Новиковъ, прав., народ. уч. (Жлобинъ).

Сврская — учит. крест. Макс. Павл. Шлеменковъ, прав., второкл. шк. (Борки).

Рогачевскій уѣздъ.

## Даваенны перыяд

У 1930 годзе быў пабудаваны новы драўляны будынак Стаўпнянскай сямігадовай школы.

1 верасня ў новую школу прыйшло 45 вучняў з навакольных вёсак Раманаўка, Шырокае, Хімы. Дзеці дабіраліся ў школу пешшу, або з бацькамі на конях. Першы выпуск Стаўпнянскай сямігадовай школы адбыўся ў 1937 годзе.

З 1930 па 1941 год дырэктарам Стаўпнянскай школы быў Нікіцін Рыгор Барысавіч, які ў 1941 годзе пайшоў на фронт і загінуў 08.03.1944. Пахаваны ён у в. Н. Канапліца Рагачоўскага раёна. Яго жонка, Нікіціна Марына Іванаўна, працавала настаўніцай пачатковых класаў.



Нікіцін Рыгор Барысавіч (1998-1944)



БССР

Народны Камісарыят Асветы

ПАСВЕДЧАННЕ

ГЭТАЕ ПАСВЕДЧАННЕ ДАДЗЕНА Івановай (прозвішча) Аксінні Кузьмовай (імя і імя па бацьку), НАРАДЗІЎШайся Ў 1921 ГОДЗЕ,
У ТЫМ, ШТО яна (ён—яна) НАВУЧАлася Ў Стаўпнянскай
НЯПОЎНАЙ СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЕ вёскі Стоўпня (вёскі, горада)
Рагачоўскага раёна (раёна) (акругі), СКОНЧЫла
ПОЎНЫ КУРС ГЭТАЙ ШКОЛЫ І ВЫЯВІла ПРЫ выдатных
ПАВОДЗІНАХ НАСТУПНЫЯ ВЕДЫ:

| | |
|---|---|
| ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ | пасрэдна |
| ПА ЛІТАРАТУРЫ | пасрэдна |
| ПА РУСКАЙ МОВЕ | пасрэдна |
| ПА ЛІТАРАТУРЫ | пасрэдна |
| ПА АРЫФМЕТЫЦЫ | пасрэдна |
| ПА АЛГЕБРЫ | пасрэдна |
| ПА ГЕАМЕТРЫІ | пасрэдна |
| ПА ПРЫРОДАЗНАЎСТВУ | пасрэдна |
| ПА ГІСТОРЫІ | пасрэдна |
| ПА ГЕАГРАФІІ | пасрэдна |
| ПА ФІЗІЦЫ | пасрэдна |
| ПА ХІМІІ | пасрэдна |
| ПА ГРАМАДАЗНАЎСТВУ | |
| ПА ЗАМЕЖНАЙ МОВЕ ( ) | |
| ПА РЫСАВАННЮ | пасрэдна |
| ПА ЧАРЧЭННЮ | добра |

19 чэрвеня 1937 г.

ДЫРЭКТАР ШКОЛЫ

НАСТАЎНІКІ:

Пасведчанне аб заканчэнні школы Івановай А. К., вучаніцы першага выпуска Стаўпнянскай няпоўнай сярэдняй школы

## 1941-1945 гады

У перыяд акупацыі (1941-1943) школа не працавала. Са снежня 1943 года ў будынку Стаўпнянскай школы размяшчаўся ваенны шпіталь.

## Пасляваенны перыяд

Адразу пасля вайны школа зноў адчыніла дзверы. Дырэктарам быў назначаны Сталяроў Аляксей Якаўлевіч. Пад яго кіраўніцтвам настаўнікі адрамантавалі будынак школы. Нагляднасці і вучэбныя дапаможнікі яны рабілі сваімі рукамі.

Разам з Аляксеем Якаўлевічам працавалі настаўнікі Міроненка Ганна Іванаўна, настаўнік беларускай мовы; Кіпцікава Клаўдзія Давыдаўна, настаўнік пачатковых класаў; Батракова Вольга Пятроўна, настаўнік пачатковых класаў; Голубева Вера Іванаўна, настаўнік матэматыкі, якая стала яго жонкай.



Сталяроў Аляксей Якаўлевіч



Голубева Вера Іванаўна

У 1949 годзе быў назначаны новы дырэктар школы – Надтачаеў Міхаіл Анісімавіч. Затым у пасадзе дырэктара працавалі Голухаў Рыгор Раманавіч і Маскалёў Іван Дзмітрыевіч. Іх дзейнасць была накіравана на дасягненне галоўнай мэты: даць як мага больш ведаў дзецям у цяжкі пасляваенны час.

У верасні 1953 года навучэнцаў сустрэў новы дырэктар – Бульбачкін Сямён Раманавіч, які працаваў у гэтай пасадзе 11 гадоў.



2008 год. Сустрэча вучняў Стаўпнянскай школы з Бульбачкіным Сямёнам Раманавічам

**XX стагоддзе (60-я гг.; 70-я гг.; 80-я – 90-я гг.)**

У 1964 годзе дырэктарам Стаўпнянскай школы назначаны Васільеў Леанід Сяргеевіч.

Школа папоўнілася вучнямі, таму вучыцца сталі ў дзве змены. Зімой дзецям давалі гарачую гарбату з кавалачкам хлеба, у вялікія маразы пасярод калідора ставілі жалезную печку-«буржуйку», вакол якой усе збіраліся грэцца. Неўзабаве ў школе з’явіўся тэлевізар, які стаў для вучняў сапраўдным цудам. У настаўніцкай зрабілі спецыяльнае вакенца, а ў калідоры ставілі лаўкі.



1970 год. Калектыў Стаўпнянскай школы:
Дзям’яненка Соф’я Філіпаўна, Голухава Аляксандра Архіпаўна, Лашкевіч Ганна Мікалаеўна, Вайценкова Алена Мікалаеўна, Батракова Вольга Пятроўна, Кірчэўскі Лука Пракопавіч, Васільеў Леанід Сяргеевіч, Кухараў Данііл Іванавіч

У 1971 годзе дырэктарам школы назначылі Длліннікаву Клару Сцяпанаўну. За 4 годы работы ў пасадзе Клара Сцяпанаўна прыклала шмат намаганняў, каб абнавіць стары будынак. Сумесна з настаўнікімі і вучнямі Клара Сцяпанаўна праводзіла цікавыя мерапрыемствы, канцэрты для калгаснікаў.



1972 г. Лінейка, прысвечаная заканчэнню вучэбнага года.
Дырэктар школы Длліннікава Клара Сцяпанаўна

У студзені 1975 года дырэктарам была назначына Рагоўская Еваліна Мікалаеўна, якая кіравала калектывам школы да лістапада 1990 года. Вялікая заслуга Еваліны Мікалаеўны ў будаўніцтве новага будынка школы, фундамент якой быў закладзены ў 1989 годзе. Сумеснымі намаганнямі Еваліна Мікалаеўна і Фядотаў Іван Дзмітрыевіч, старшыня калгаса, дабіліся дапрацоўкі праекта будынка, у выніку якога было прыбудавана памяшканне сталовай. У сакавіку 1990 года новая школа расчыніла свае дзверы.

Да чэрвеня 2008 года Еваліна Мікалаеўна плённа працавала настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, была класным кіраніком. Памерла Рагоўская Е.М. 26.08.2019 года.



Рагоўская Еваліна Мікалаеўна



1978 год. 2 клас: Міхаленка Ларыса, Яначкін Леанід, Кучмень Раіса, Кандраценка Віктар, Сімакіна Наталля, Жызнеўская Наталля, Жыранкова Жанна, Болдыраў Валерый, Дзям'яненка Марыя, Семчанка Лідзія Пятроўна

З лістапада 1990 года па верасень 1991 года выконваючай абавязкі дырэктара школы з’яўлялася Вайцянкова Алена Іванаўна. Дзякуючы яе намаганням у 1991 годзе Стаўпнянская школа была рэарганізавана з васьмігадовай у сярэднюю. Усё сваё працоўнае жыццё Алена Іванаўна прысвяціла педагагічнай працы, выкладала рускую мову і літаратуру.



Вайцянкова Алена Іванаўна

З 1991 года па 1994 год дырэктарам Стаўпнянскай сярэдняй школы працаваў Старавойтаў Мікалай Паўлавіч, які ўнёс вялікі ўклад у развіццё спартыўнай базы школы, фізічнае выхаванне вучняў.



1991 год. Калектыў Стаўпнянскай сярэдняй школы:
Гарчынская Алена Леанідаўна, Радчанка Святлана Рыгораўна,
Камок Наталля Мікалаеўна, Атрохава Галіна Васільеўна,
Венсянская Маргарыта Іванаўна, Жураўлёва Таццяна Леанідаўна, Бондарава Надзея Леанідаўна, Старавойтаў Мікалай Паўлавіч, Вайцянкова Алена Іванаўна,
Лявоненка Марыя Рыгораўна, Рагоўская Эваліна Мікалаеўна



1993 год. Вучні, якія прыйшлі ў 1 клас у будынак старай школы, а скончылі навучанне ў новай школе: Дзям'яненка Таццяна, Атрохава Алена, Васільева Таццяна, Дзяко Таццяна. Настаўніца Камок Наталля Мікалаеўна.



1993 год. Першы выпуск Стаўпнянскай сярэдняй школы:
Клімаў Сяргей, Шчадрова Аксана, Жыранкова Аляксандра, Шубянок Ігар

У 1994 годзе дырэктарам школы была назначана Менькова Валянціна Пятроўна. За час яе кіраўніцтва школа набыла новы від, з'явіліся і ўмацаваліся новыя школьныя традыцыі.



Менькова Валянціна Пятроўна

Вялікую ўвагу Валянціна Пятроўна надавала прафесійнаму росту педагогаў, павышэнню прэстыжу настаўніка. Дзякуючы ёй большасць настаўнікаў Стаўпнянскай агульнаадукацыйнай школы атрымалі вышэйшую адукацыю, павысілі кваліфікацыйную катэгорыю. Арыентавала яна і вучняў на атрыманне педагагічнай спецыяльнасці: больш за 15 яе выпускнікоў абралі ў якасці сваёй прафесіі прафесію педагога.



1996 год. Выпуск 11 класа
Пашкоўская Таццяна, Уласенка Аляксей, Мельнікава Святлана, Менькова Валянціна Пятроўна, Сачок Алена, Лявоненка Сяргей, Кавалёва Ірына Міхайлаўна, Каралёва Вольга Васільеўна, Талкачова Таццяна Іванаўна, Сакалова Ірына Ермалаеўна, Рагоўская Еваліна Мікалаеўна, Атрохава Галіна Васільеўна

Пачатак работы Меньковай В.П. як дырэктара школы прыйшлося на той час, калі піянерскі рух спыніў сваю дзейнасць. Па ініцыятыве Валянціны Пятроўны і пад энергічным кіраўніцтвам намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце Купрацэвіч Таццяны Георгіеўны ў 2002 годзе ў Стаўпнянскай школе была створана піянерская экалагічная дружына «Першацвет». Экалагічны накірунак стаў адным з прыярытэтных у жыцці школы.




2002 год. Утварэнне Стаўпнянскай піянерскай экалагічнай арганізацыі «Першацвет»

Дзякуючы энтузіазму настаўнікаў і вучняў рэалізаваны экалагічныя праекты «Экалагічная сцежка», «Школьны двор», «Сад пахаў», «Парк» і інш.




Пачатак экалагічнай сцежкі



Сад пахаў

Валянціна Пятроўна садзейнічала наладжванню ўзаемадзеяння з жыхарамі нямецкага горада Шнэфердынген, якія арганізавалі акцыю «Дапамога дзецям Чарнобыля», дзякуючы якому вучні нашай школы штогод выязджалі на аздараўленнне ў Германію.




2010 год. Кіраўнік нямецкай групы Барбара Коль і настаўнік нямецкай мовы Лявоненка Таццяна Іванаўна




2012 год. Навучэнцы Стаўпнянскай школы
ў складзе арганізаванай групы дзяцей на аздараўленні ў Германіі

З 2010 года Стаўпнянскую сярэднюю школу ўзначаліла Цішкова Валянціна Савічна, якая працягнула работу па павышэнні прафесійнага ўзроўню педагогаў, стварэнні спрыяльных умоў для ўсебаковага развіцця вучняў, рэалізацыі іх творчых здольнасцей, павышэнні якасці навучання, умацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы школы.




Абноўлены выгляд вучэбных кабінетаў

У рэалізацыю экалагічнага накірунка работы школы Валянціна Савічна ўнесла новую традыцыю – правядзенне міжшкольнага конкурсу экалагічных праектаў «Дадзім шар зямны дзецям».




Фрагменты міжшкольнага конкурсу экалагічных праектаў

Вынік павышэння якасці адукацыі –залатыя медалісты (Кухарэнка Аліна, Мельнікава Яна, Лаўрэнцьева Аліна) і пераможцы заключнага этапу Рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах (Кавалёў Максім, «Працоўнае навучанне (тэхнічная праца)», педагог Атрохаў Аляксандр Мікалаевіч, Атрохаў Дзяніс, «Гісторыя Беларусі», педагог Бондарава Надзея Леанідаўна).

**Педагогі – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны**



Нікіцін Рыгор Барысавіч



Сталяроў Аляксей Якаўлевіч



Бульбачкін Сямён Раманавіч



Кухараў Данііл Іванавіч



Батракова Вольга Пятроўна

Байкачоў Франс Пятровіч, 1917 г.н., ст. сяржант

Вінікаў Лука Пракопавіч, 1915 г.н., радавы

Дамброўскі Пётр Лявонцьявіч, 1921 г.н., ст. сяржант